Раіса Раманеня

педагог дадатковай адукацыі ДУДА «Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна», (г. Салігорск, Беларусь)

# Саломапляценне і аплікацыя саломкай: сучасны стан і перспектывы развіцця

Непаўторнасць і самабытнасць, духоўная ўнікальнасць кожнага народу адлюстроўваецца ў яго творчасці. Духоўная скарбніца нематэрыяльнай культуры ствараецца цягам стагоддзяў талентам і высілкамі вядомых і невядомых майстроў. Яна — крыніца натхнення для наступных пакаленняў, для тых, хто імкнецца ствараць і працягваць традыцыі, якія належаць гэтай зямлі, што дадзена Богам.

Саломапляценне і аплікацыя саломкай займаюць асаблівае месца ў мастацкай культуры Беларусі. Гэты від рамяства як бы «візітоўка», такі своеасаблівы беларускі сувенір. Вядома, што народы, якія займаліся земляробствам, умелі рабіць з саломы розныя рэчы, а потым ужываць іх у гаспадарцы. Вельмі важнае значэнне надавалася культавым абрадам з пшаніцай, жытам. Колас, хлебная ніва абагаўляліся, бо давалі жыццё. Гэта быў крытэрый дабрабыту і заможнасці. Калі трэба было сказаць, што чалавек багаты, то казалі: «Ён па пуза ў саломе». На сённяшні дзень у некаторых краінах свету яшчэ засталіся майстры, якія валодаюць тэхнікай вырабу культавых рэчаў з саломы. Вядомая швейцарская тэхніка вырабу карункаў з саломы перажывае заняпад. Тэхніка маркетры, што была распаўсюджана ў манастырах дамініканскага ордэна, існуе сёння ў адной майстэрні ў Францыі. У Сербіі да гэтага часу ёсць майстры, што займаюцца сваеасаблівай тэхнікай аплікацыі саломкай. Венгрыя захавала сваю традыцыю пляцення падвясных сімвалаў ураджаю. Першы Міжнародны фестываль майстроў саломкі, які прайшоў у 2005 г. у Мінску, стаў адкрыццём беларускага мастацтва саломапляцення іншым краінам свету. Сапраўды, беларуская саломка вельмі адметная, яна мае вялікі дыяпазон тэматычных вырабаў. Акрамя побытавых вырабаў мы маем вялікую колькасць розных дэкаратыўных форм сапраўдных мастацкіх рэчаў. Што спрыяла росквіту гэтага мастацтва ў краіне? Каму аддаць даніну павагі за тое, што да гэтага часу мы яго збераглі?

Зразумела, што існавала традыцыя на тэрыторыі Беларусі. Але з развіццём прамысловасці, з нагоды пераезду моладзі ў горад ды, наогул, са

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знікненнем попыту пачалі губляцца некаторыя прыёмы вырабу саламяных рэчаў. Вось тут і з'явілася ідэя зрабіць народную традыцыю, як бы мовіць, нацыянальным брэндам. Фарміраванне нацыянальнага стылю звязана з іменем В. І. Гаўрылюк (у 2015 г. адзначылі 110-годдзе майстра). Менавіта В. І. Гаўрылюк успомніла і ўзнавіла тыя прыёмы, якімі валодала яе маці. Дзякуючы падтрымцы і зацікаўленасці дзяржавы, энтузіязму майстроў і мастацтвазнаўцаў мы маем свой непаўторны нацыянальны сувенір з саломкі. Далей справу прадоўжылі мастакі і пераемнікі патрыярха беларускай саломкі: дачка Т. П. Агафоненка, яе паплечніцы і сяброўкі Л. М. Лось, Л. Р. Главацкая. Яны ўзбагацілі традыцыю, надалі ёй рысы свайго часу. З простых, інсітных вырабаў гэта рамяство паднялося да ўзроўню высокамастацкіх рэчаў.

Канец XX і пачатак XXI ст. сталі росквітам беларускай саломкі. У мастацкіх УВА пачалі выкладаць дысцыпліну — «мастацкая саломка». Вырасла новая плеяда майстроў і мастакоў. Кожны ўнёс свае бачанне, свае прыёмы ў гэта рамяство ці, лепш сказаць, мастацтва. З сялянскага асяроддзя саломка пераехала ў гарадское. На свет з'явіліся надзвычай цікавыя, высокамастацкія рэчы. Саломка паступова адкрыла ўсе свае дэкаратыўныя якасці, пашырыўся дыяпазон, асартымент вырабаў: дэкаратыўныя коні, птушкі, лялькі неверагоднай прыгажосці. Амаль усе майстры пачалі вырабляць кветкі, але ў кожнага яны адметныя. Галаўныя ўборы, артыстычныя формы, маскі, пано. Дэкаратыўнасць саломкі набыла высокі ўзровень. Духоўная сіла беларускай саломкі адрадзілася з мастацкім усведамленнем і сучасным гучаннем, любоўю майстроў да гэтага простага і старога, як свет, матэрыялу.

Аб'ектыўны працэс радыкальнай змены быцця чалавека ў свеце абумоўлены глыбіннымі зрухамі ў спосабах і тыпах дзейных і міжасобасных зносін у агульнапланетарным маштабе. Інфармацыйная рэвалюцыя канца XX ст. ператварыла ў рэальнасць ідэю аб адзіным узаемазалежным і ўзаемаўзгодненым свеце, набываючым рысы «сусветнай вёскі» (ЮНЕСКА). Камп'ютарызацыя, інтэрнэт, спадарожнікавыя камунікацыі звязваюць разам эканоміку, навуку, культуру ўсіх краін і рэгіёнаў свету. Ствараецца сітуацыя камунікатыўнай празрыстасці, перацякання інфармацыйных патокаў, якія не ведаюць ніякіх межаў і дэмаркацыйных ліній. Інтэрнэт утварае новую віртуальную рэальнасць, новую імперыю са сваімі законамі і нормамі. І ніхто не ў стане супрацьстаяць гэтаму аб'ектыўнаму працэсу, калі не хоча апынуцца на ўзбочыне сусветнай гісторыі. Глабалізацыя, сутнаснай асновай якой з'яўляецца інфармацыйная рэвалюцыя, аказвае вырашальны ўплыў на



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўсе сферы чалавечага жыцця — эканоміку, палітыку, культуру, мову, адукацыю, міжэтнічныя і міжканфесійныя адносіны. Усе гэтыя сферы, уцягнутыя ў паскораны тэмп засваення і абмену інфармацыяй, набываюць якасна новыя рысы.

Асноўная характарыстыка працэсу глабалізацыі, які адбываецца сёння, — трансляцыя ліберальна-дэмакратычных каштоўнасцей на ўсе рэгіёны без выключэння. Гэта значыць, што палітычныя, эканамічныя, прававыя і іншыя сістэмы ўсіх краін свету становяцца ідэнтычнымі, і ўзаемазалежнасць краін дасягае небывалых маштабаў.

Прадстаўнікі самабытных культур, свядома ці не, адчуваюць, што за эканамічнымі, палітычнымі, прававым і тэхналагічнымі крокамі глабалізацыі рушаць услед і пабочныя эфекты, якія, у першую чаргу, выклікаюць змены іх традыцый, культуры і жыццёвага ўкладу.

Нацыя ўсведамляе сваё адзінства, мае гістарычную памяць, з дапамогай якой успрымаецца яе мінулае ў якасці асновы сучаснага і будучага. У нацыянальнай самасвядомасці сувязь часоў асмыслена як адзіная бесперапыннасць, таму захоўваецца кантакт нават з далёкімі продкамі: яны і іх дзеянні перманентна прысутнічаюць у жыцці сучаснікаў. Лад жыцця, які вызначаны культурай, разглядаецца не проста як ардынарны бытавы фактар, а як значная заваёва, для дасягнення якой спатрэбіліся стараннасць і праца многіх пакаленняў. Для нацыянальнай свядомасці ўласны жыццёвы ўклад нацыі ўспрымаецца не толькі як своеасаблівы, уласцівы толькі яму спосаб афармлення жыцця, але і як перавага ў адносінах да іншых культур.



Але, з іншага боку, калі настойваць на сваёй самабытнасці і не клапаціцца аб тым, каб быць «пачутымі», каб стаць цікавымі сусветнай супольнасці, узнікае небяспека застацца цікавымі толькі самім сабе, значнымі толькі ў гарызонце сваіх нацыянальных каштоўнасцей, г.зн. апынуцца ў стане культурнай ізаляцыі. І калі ў такі «запаведнік» нацыянальнай культуры ўрываецца актыўная заходняя маскультура, апошняй не трэба шмат часу на ўсталяванне свайго панавання.

Сёння з упэўненасцю можна сказаць, што эпоха ручнога дамашняга вырабу рэчаў для асабістых патрэб завяршаецца. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва губляе адну з важнейшых сваіх функцый — утылітарнасць. І калі далей пойдзе размова пра рэчы з саломкі, то тут гэта выяўлена вельмі ярка. Аб'ектыўная рэальнасць у тым, што ўсё, патрэбнае чалавеку ў гаспадарцы, цяпер робяць з дапамогай машын. Культавыя вырабы страцілі сваю актуальнасць і засталіся ў выглядзе абярэгаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрамя таго, калі раней пляценнем з саломкі займаліся ў асноўным жыхары вёскі, то сёння большасць майстроў маюць гарадскую прапіску. Гаражанам складана знайсці салому для працы. Зразумела, што і захоўваць вялікую колькасць саломкі ў гарадской кватэры нерэальна. Такім чынам, усё менш і менш майстроў займаецца гэтым рамяством. Па маіх назіраннях, нават фестывалі па пляценню з саломкі згубілі сваіх прыхільнікаў і ўдзельнікаў. На выставах дзіцячай творчасці менш гурткоў саломапляцення паказваюць свае вырабы. На маю думку, мастацкія рамёствы не знікнуць, а набудуць зусім іншую функцыю. Ужо сёння людзі цікавяцца рамёствамі і жадаюць атрымаць навыкі работы з матэрыялам. Вельмі папулярнымі становяцца майстар-класы. Але вось матывы ў людзей для заняткаў рамёствамі, у тым ліку саломапляценнем, іншыя. На першы план выходзіць магчымасць і жаданне зрабіць нешта сваімі рукамі, як бы мовіць, рэалізаваць свае памкненні. А прычына таму — уплыў глабалізацыі: усё камфортна і прыстасавана да патрэб чалавека. Сёння ўжо рэдка хто адмаўляецца ад даброт цывілізацыі, толькі вось уласная прырода чалавека мусіць знайсці сабе магчымасць для медытацыі, для рэалізацыі творчага патэнцыялу. Менавіта мастацкія рамёствы, выяўленчае мастацтва здольны выконваць гэтую функцыю.



Больш як 30 гадоў я займаюся мастацкай апрацоўкай саломкі. За гэты час асвоіла ўсе тэхнікі работы з гэтым матэрыялам (аплікацыю, пляценне, інкрустацыю). Вучылася сама і вучыла дзяцей. Шматгадовая практыка, мастацкая адукацыя, любоў і павага да простага матэрыялу — саломы прынеслі мне шмат задавальнення, дапамаглі стаць майстрам, творчым чалавекам.

Сёння студыя «Беларускі сувенір», якой я кірую, — заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь. А пачыналася ўсё са звычайнага гуртка па інкрустацыі саломкай. Першыя гады сваёй працы гурткоўцы вучыліся рабіць інкруставаныя пано, куфэркі, — усё тое, што ўмела рабіць на той час іх малады кіраўнік, якая скончыла Бабруйскае мастацкае вучылішча. Ішоў час, і я пачала цікавіцца традыцыямі мастацкіх рамёстваў свайго рэгіёна (поўдня Мінскай вобласці). Аказалася, што тут існавала свая адметная традыцыя вырабу саламяных дываноў. На аснове традыцыйных вырабаў былі зроблены ўзоры для гурткоўцаў. Першыя работы выклікалі захапленне ў гледачоў і прыхільнікаў народнага мастацтва, многія пачалі ўспамінаць, што бачылі такія дываны ў дзяцінстве, а некаторыя нават самі выраблялі з маці альбо бабуляй саламяны дыванок. Але са з'яўленнем прамысловых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вырабаў саламяныя дыванкі пахавалі на гарышчы, перасталі вырабляць. На той час, а гэта 1985 г., традыцыя амаль знікла. Засталіся фота і звесткі пра майстроў. Вось тая інфармацыя ды расказы сведак і сталі асновай для адраджэння ўжо амаль забытага рамяства. За кароткі час мы ўзнавілі рамяство дываноў. Беражліва паставіліся да стылістыкі, улюбёных тэм народных майстроў. Букеты, птушкі, звяры, шмат кветак — усё гэта засталося ў нашых вырабах. Колер, які выкарыстоўвалі майстры, фон дыванка, прыёмы наклейвання саломкі засталіся нязменнымі.

Час ідзе, і традыцыя набывае сучасны твар, адаптуецца да сённяшняга дня. Сапраўды, няма патрэбы ў вялікіх дыванах, але чаму б не зрабіць пано для сучаснага інтэр'ера? Перыяд з 1985 па 1992 г. быў асабліва плённым. Мною былі распрацаваны новыя прыёмы аздаблення. Пано з выявамі букетаў атрымаліся дэкаратыўнымі, добра распрацаванымі і ідэальнымі па тэхніцы выканання. Адценні саломкі выкарыстоўваліся натуральныя, таксама ўжывалася таніраваная саломка, якая вельмі арганічна спалучаецца з прыродным колерам.



Год за годам адточваліся прыёмы выканання, тэхніка. З'явіліся свае сакрэты падбору саломкі, удасканальваліся тэхнічныя характарыстыкі. Была зроблена вялікая колькасць работ, якія і сёння захоўваюцца і складаюць залаты запас студыі. Конкурсы прыносілі поспех, што сведчыла аб цікавасці і ўвазе да аднаўленага рамяства.

Хацелася б, каб рамяства, якое мы з навучэнцамі студыі ўзнавілі, засталося і развівалася. Магчыма, прыйдзе час, калі яно зноў будзе запатрабавана, але зараз патрэбна яго захаваць.

Спадзяюся, што народнае мастацтва, якое ідзе з глыбінь цывілізацыі, будзе запатрабавана, можа, у другой якасці, але застанецца як адметнасць беларускага этнасу ў кантэксце сусветных культур.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ